**ДАГАВОР**
**на аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні**
**для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння**

г.Мінск «_______» _______________20_____г. №______

Камунальнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства па эксплуатацыі і рамонце камунальных цеплавых сетак і кацельняў «Мінсккамунцепласетка» (УП «Мінсккамунцепласетка»), названае ў далейшым Выканаўца, у асобе дырэктара Рошчынай Наталлі Мікалаеўны, які дзейнічае на падставе Статута з аднаго боку, і ўласнік, наймальнік, член арганізацыі забудоўшчыкаў, дольшчык, які заключыў дагавор, што прадугледжвае перадачу яму ў валоданне і карыстанне аб'екта долевага будаўніцтва, лізінгаатрымальнік (патрэбнае падкрэсліць)

_______________________________________________________________________

(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, калі такое маецца)

жылога памяшкання ____________________ у жылым доме ______ корп. _____, па вул. ______________________________________, названы ў далейшым Спажывец, с другога боку, далей названыя Бакамі, заключылі дадзены дагавор аб наступным:

**Прадмет дагавора**

1. Выканаўца абавязваецца аказаць на ўмовах, прадугледжаных дадзеным дагаворам, Спажыўцу паслугі па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння шляхам падачы цеплавой энергіі на ўвод індывідуальнага цеплавога пункта жылога дома, а Спажывец абавязваецца аплачваць аказаныя паслугі ў адпаведнасці з тарыфамі і ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам

**Абавязкі бакоў**

2. Выканаўца абавязаны:

2.1. забяспечваць своечасовае аказанне Спажыўцу паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння належнай якасці з захаваннем устаноўленых заканадаўствам сацыяльных стандартаў (нарматыву ацяплення жылых памяшканняў, нарматыву тэмпературы гарачай вады);

2.2. інфармаваць Спажыўца аб змяненні тарыфаў на цеплавую энергію праз сродкі масавай інфармацыі ці іншым спосабам;

2.3. апавяшчаць Спажыўца пра прычыны і тэрміны перапынкаў у аказанні паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння праз сродкі масавай інфармацыі або іншым спосабам не пазней чым за тры дні да пачатку перапынку ў сувязі з:

- правядзеннем планавых рамонтных і прафілактычных работ у адпаведнасці з графікамі (планамі), узгодненымі з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама рамонтных і прафілактычных работ па заяўках Спажыўцоў;
- міжацяпляльным перыядам;
- прыпыненнем аказання камунальных паслуг спажыўцу, які мае, без уважлівых прычын, запазычанасць па іх аплаце і не пагасіць яе ў вызначаныя тэрміны;

2.4. ажыццяўляць аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення ў тэрміны, устаноўленыя адпаведным рашэннем мясцовага выканаўчага ці распарадчага органа аб пачатку (завяршэнні) ацяпляльнага перыяду;

2.5. выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам.

3. Спажывец абавязаны:

3.1. забяспечыць своечасовую аплату паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны;

3.2. забяспечваць цэласнасць і захаванасць сістэмы ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння, якая знаходзіцца ў жылым памяшканні, у тым ліку прыбораў індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі, размеркавальнікаў цяпла на ацяпляльных прыборах;
3.3. неадкладна паведамляць у арганізацыю, якая абслугоўвае ўнутраныя інжынерныя сістэмы будынка аб няспраўнасці сістэмы ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння, якая знаходзіцца ў жылым памяшканні, у тым ліку прыбораў індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі, размеркавальнікаў цяпла на ацяпляльных прыборах і аб іншых парушэннях, якія перашкаджаюць аказанню паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння;
3.4. забяспечыць доступ прадстаўнікам Выканаўцы (пры прад'яўленні імі службовага пасведчання) да змешчаных у жылым памяшканні сістэм ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння, у тым ліку прыбораў індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі, размеркавальнікаў цяпла на ацяпляльных прыборах для правядзення аглядаў, а таксама ў іншых выпадках, вызначаных заканадаўствам;
3.5. не дапускаць разбору цепланосьбіта з сістэмы цэнтралізаванага цеплазабеспячэння;
3.6. не пашкоджваць разліковыя прыборы ўліку расходу цеплавой энергіі (пры іх наяўнасці), у тым ліку не парушаць пломбы на прыборах індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі (пры іх наяўнасці), не ажыццяўляць наўмыснае іх пашкоджанне або дэмантаж, не ажыццяўляць дзеянні, якія скажаюць іх паказанні, або наўмысна не ажыццяўляць пашкоджанне прыбораў індывідуальнага ўліку расходу цеплавой энергіі;
3.7. выконваць іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам.

## Правы Бакоў

4. Выканаўца мае права:
4.1. патрабаваць ад Спажыўца выканання заканадаўства і ўмоў гэтага дагавора;
4.2. без узгаднення са Спажыўцом спыніць ці абмежаваць аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння ў выпадку аварый, стыхійных бедстваў і іншых надзвычайных сітуацый і ліквідацыі іх наступстваў, крадзяжу, знішчэння або пашкоджання сетак і абсталявання, якія робяць немагчымым аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння альбо ствараюць пагрозу прычынення шкоды жыццю, здароўю і (або) маёмасці Спажыўца;
4.3. іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам.
5. Спажывец мае права:
5.1. патрабаваць ад Выканаўцы выканання заканадаўства і ўмоў гэтага дагавора;
5.2. атрымліваць своечасова, у поўным аб'ёме паслугі па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння належнай якасці;
5.3. удзельнічаць у зняцці паказанняў прыбораў групавога ўліку расходу цеплавой энергіі (пры іх наяўнасці). Доступ у індывідуальны цеплапункт жылога дома ажыццяўляе арганізацыя, якая абслугоўвае ўнутраныя інжынерныя сістэмы будынка;
5.4. патрабаваць ад Выканаўцы поўнай і своечасовай ліквідацыі выяўленых недахопаў пры аказанні паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння;
5.5. іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## Парадак разлікаў за паслугі цеплазабеспячэння і гарачага водазабеспячэння

6. Налічэнне платы за паслугі па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым у адпаведнасці з заканадаўствам.

7. Аплата паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння ажыццяўляецца Спажыўцом штомесяц, за кожны мінулы месяц не пазней як 25-га чысла, наступнага за ім месяца.

## Адказнасць Бакоў

8. Бакі нясуць адказнасць за невыкананне абавязкаў па дадзеным дагаворы ў адпаведнасці з яго ўмовамі і заканадаўствам.
9. Бакі не нясуць адказнасці па сваіх абавязках, калі:
9.1. у перыяд дзеяння гэтага дагавора адбыліся змены ў заканадаўстве, якія робяць немагчымым іх выкананне;
9.2. невыкананне з'явілася следствам абставін непераадольнай сілы, якія ўзніклі пасля заключэння гэтага дагавора ў выніку падзей надзвычайнага характару.

Бок, для якога ўзніклі ўмовы, пры якіх немагчыма выканаць абавязкі па гэтым дагаворы, абавязаны апавясціць другі Бок аб надыходзе і спыненні гэтых абставінаў любым даступным спосабам.
10. Выканаўца абавязаны пакрыць страты, шкоду, нанесеныя ім жыццю, здароўю і (або) маёмасці Спажыўца з прычыны неаказання жыллёва-камунальнай паслугі або аказання паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння з недахопамі, у тым ліку з прычыны прымянення ў працэсе іх аказання тэхналогій, небяспечных для жыцця, здароўя і (або) маёмасці Спажыўцоў, а таксама навакольнага асяроддзя.

Спажывец мае права патрабаваць ад Выканаўцы кампенсацыю маральнай шкоды, прычыненай парушэннем правоў спажыўца жыллёва-камунальных паслуг, незалежна ад маёмаснай шкоды, што падлягае пакрыццю. Памер кампенсацыі маральнай шкоды вызначаецца судом.
11. Выканаўца не нясе адказнасці, не пакрывае Спажыўцу страты цалкам або часткова і не кампенсуе прычыненую рэальную шкоду маёмасці, калі яна паўстала ў выніку:

- стыхійных бедстваў;
- аварый інжынерных сетак ці іншага абсталявання, якія адбыліся не па віне Выканаўцы, і пры немагчымасці апошняга прадугледзець або ліквідаваць прычыны, якія выклікалі гэтыя аварыі.

Выканаўца не нясе адказнасці за невыкананне сацыяльнага стандарту па ацяпленні і гарачым водазабеспячэнні, выкліканае неадпаведнасцю праектнай дакументацыі, станам, а таксама парушэннем у працы абсталявання, ІЦП, сістэмы ацяплення, будаўнічых канструкцый, самавольнымі зменамі, унесенымі ў канструктыўныя элементы будынка, ІЦП, сістэмы ацяплення, сістэмы гарачага водазабеспячэння. Адказнасць у дадзеным выпадку нясе ўпаўнаважаная асоба.
12. За несвоечасовую і (або) не ў поўным аб'ёме ўнесеную плату за прадстаўленыя ў адпаведнасці з гэтым дагаворам паслугі Спажывец выплачвае Выканаўцу пеню ў памеры 0,3 працэнта ад нявыплачанай ва ўстаноўлены тэрмін сумы плацяжу за кожны дзень пратэрміноўкі.
13. За парушэнне падпункта 3.6 пункта 3 гэтага дагавора Спажывец прыцягваецца да адказнасці, устаноўленай Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.

## Тэрмін дзеяння дагавора

14. Дадзены дагавор заключаны на нявызначаны тэрмін.

## Змяненне і скасаванне дагавора

15. Бакі маюць права па ўзаемным пагадненні датэрмінова змяніць або скасаваць дадзены дагавор.

16. Спажывец мае права ў любы час у аднабаковым парадку адмовіцца ад дагавора на аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні для патрэб ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння поўнасцю або часткова, калі неаказанне дадзеных паслуг тэхнічна магчыма, папярэдне не менш чым за месяц, а калі такі дагавор заключаны на тэрмін менш за адзін месяц, – не менш чым за пяць дзён, накіраваўшы Выканаўцу адпаведнае пісьмовае папярэджанне.
17. Змены ў дадзены дагавор уносяцца шляхам заключэння дадатковага пагаднення, якое з'яўляецца неад'емнай часткай гэтага дагавора.
18. Пагадненне аб змене або скасаванні дадзенага дагавора заключаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца кожным з Бакоў.

**Вырашэнне спрэчак**

19. Спрэчкі, звязаныя з выкананнем абавязкаў па дадзеным дагаворы, вырашаюцца Бакамі шляхам перамоў, а ў выпадку недасягнення згоды – у судовым парадку.
20. Прэтэнзіі па выкананні ўмоў дадзенага дагавора могуць заяўляцца Бакамі ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

**Іншыя ўмовы**

21. Узаемаадносіны Бакоў, не ўрэгуляваныя дадзеным дагаворам, рэгламентуюцца заканадаўствам.
22. Гэты дагавор складзены на _______ лістах у двух экземплярах, якія маюць аднолькавую юрыдычную сілу і захоўваюцца ў кожнага з Бакоў.
23. Бакі прымаюць выкарыстанне факсімільнага ўзнаўлення подпісу ўпаўнаважанай асобы Выканаўцы і адбітка пячаткі Выканаўцы з дапамогай сродкаў механічнага ці іншага капіравання пры заключэнні гэтага дагавора. Пры гэтым бакі прызнаюць юрыдычную сілу факсімільнага ўзнаўлення подпісу і адбітка пячаткі Выканаўцы на дагаворы і на ўсіх іншых дакументах, звязаных з дадзеным дагаворам або накіраваных на яго выкананне.

**Рэквізіты і подпісы Бакоў**

| | |
|---|---|
| Выканаўца: | Спажывец: |
| УП «Мінсккамунцеплασетка» | ___________________________ |
| Адрас: 220049, г.Мінск | ___________________________ |
| Вул. Валгаградская, 12 | Адрас: ____________________ |
| Тэлефон: 389 28 09; 389 28 10 | ___________________________ |
| 389 28 11; 389 28 17; 389 28 18; | |
| Тэлефон дыспетчарскай: 272-78-88; | Тэлефон: __________________ |
| ______________ Н.М. Рошчына | ______________ |
| *подпіс* | *подпіс* |